Германия выступала в роли инициатора акции, защитника немецкого населения. При этом важно подчеркнуть, что защищая «чистокровных арийцев», разрешая выезжать ла- тышам, эстонцам, литовцам, белорусам, украинцам и русским в качестве членов их се- мей, Германия в то же время лишала возможности выезда нежелательных инородных элементов.

Вопрос о выселении немцев с территории Советского Союза решался помимо руко- водства советских республик, на территории которых они проживали. В состав смешанных комиссий по проведению переселения не было включено ни одного представителя союз- ной республики, ни одного сотрудника республиканских исполнительных органов.

Таким образом, если со стороны СССР переселение немцев из территорий, которые в результате пакта Риббентропа — Молотова стали советскими, — депортация, то со сто- роны Германии — по сути то же. Обе стороны, — внешне дружественные, готовились к войне друг с другом, поэтому каждый рейхдойче и фольксдойче, желавший остаться на советской территории, рассматривался как враг.

*Литература*


1. Ингеборг Фляйшхауэр. Пакт Гитлер, Сталин и инициатива германской дипломатии. 1938—193 Пер. с нем. / Вступ. сл. В. М. Фалина; Предисл. Л. А. Безыменского. М., 1990.
2. Loeber D.A. Diktierte Option. Die Umsiedlung der Deutschbalten aus Estland und Lettland 1939– 1941. Neumunster, 1972.
3. Hehn I. Die Umsiedlung der baltischen Deutschen. Das letzte Kapitel baltisch–deutscher Geschicht Marburg / Lahn. 1982.
4. Benjamin Pinkus / Ingeborg Flischhaner. Die Dentschen in den Sowjetunion. Baden-Baden. 1987.
5. Крупников П. Я. Полвека истории Латвии глазами немцев (конец XIX века — 1945 год). Рига 1989.
6. Baltische Briefe. 1964. № 11.
7. Bundes Archiv (BA, ZSg 101)



*А. П. Жытк*

*г. Мінск, БДП*


## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ 1861—1914 ГГ.

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, з пераходам яго да рынкавы эканамічных адносін, якія парываюць з сацыялістычнай маёмаснай справядлівасцю і фар міруюць сацыяльную градацыю насельніцтва і адпаведную ментальнасць, зварот гісторы каў да працэсаў станаўлення і развіцця капіталізму мае не толькі навукова-тэарэтычнае але і практычнае значэнне.

Савецкая гістарычная навука, у тым ліку і беларуская, якая абапіралася на марксіс ка-ленінскую метадалогію, прызнавала некаторыя станоўчыя моманты рыначнай эканомі (развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, фарміраванне буржуазіі і рабочаг класу і г. д.), але, кіруючыся асноўнымі палажэннямі ленінскай дактрыны, яны даказвал што на этапе імперыялізму капіталізм вычарпаў сябе як эканамічная сістэма і, што сама галоўнае, сфарміраваў свайго магільшчыка — пралетарыят. Класавая барацьба (рухаві прагрэсу ў антаганістычным грамадстве) рабочага класа з буржуазіяй у адпаведнасці марксісцка-ленінскай канцэпцыяй перманентна вяла да ліквідацыі рыначных адносін, ула ды буржуазіі і ўсталявання сацыялістычна-размеркавальнай сістэмы як больш прагрэсі най і сацыяльна справядлівай.

Зразумела, што пры такім спрошчаным падыходзе, дваранству як саслоўю, якое з'яўлялася прадуктам феадальнай эпохі, адводзілася адмоўная роля. У савецкай гістарыяграфіі вышэйшае саслоўе выступала як носьбіт прыгонніцкіх перажыткаў, як клас, дзякуючы якому манархія праіснавала да 1917 г. Пры гэтым амаль не рабілася спроб высветліць нацыянальныя асаблівасці дваранства розных рэгіёнаў імперыі, асабліва на тэрыторыі Беларусі. Больш уважлівы падыход да беларускага набілітэту, які ў сваёй большасці быў каталіцкага веравызнання, паказвае, што ён з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай знаходзіўся ў апазіцыі да самадзяржаўя. Практычна да сярэдзіны 50-х гг. гісторыя дваранства, як і іншых «эксплуататарскіх класаў» у савецкай гістарыяграфіі не вывучалася. Гэтая праблематыка, як заўважыў М. І. Паўленка, адносілася да «паўзабароненых тэм» [1, с. 20]

Такім чынам, вышэйшае саслоўе, якое адыгрывала важную ролю ў жыцці капіталістычнага грамадства Беларусі, у сілу свайго эканамічнага, палітычнага і маральнага статусу, па сутнасці ігнаравалася ў працах савецкіх гісторыкаў. У апошнія гады, нягледзячы на актывізацыю навукова-даследчай працы ў галіне забароненых раней тэм, гісторыя дваранства Беларусі перыяду капіталізму яшчэ не стала прадметам спецыяльнага даследавання. Гэта не дае магчымасці паказаць гісторыю беларускага грамадства ў парэформенны час у яе паўнаце, адысці ад аднабаковасці і схематызму ў высвятленні складаных працэсаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краю, фарміравання беларускай нацыі.

Гістарыяграфічны аналіз любой праблемы вымагае ад даследчыка шэрага метадычных патрабаванняў. Каб, па-магчымасці, пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак, гісторык павінен прытрымлівацца прынцыпаў гістарызму, аб'ектыўнасці, каштоўнаснага падыходу. Мы ацэньваем заслугі навукоўцаў, зыходзячы з таго, які ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі больш познія даследчыкі ў параўнанні са сваімі папярэднікамі. Пры гэтым неабходна ўлічваць характар грамадска-палітычнай сітуацыі ў той ці іншы час, узровень развіцця гістарычнай навукі ў цэлым і г. д. У сувязі з гэтым вывучэнне гісторыі Беларусі можна ўмоўна падзяліць на наступныя этапы: дарэвалюцыйны, савецкі (тут навукоўцы яго падраздзяляюць на падэтапы: I — 20-я гг., II — 30-я — сярэдзіна 50-х гг., III — другая палова 50-х — сярэдзіна 80-х гг., IV — другая палова 80-х — пачатак 90-х гг.) [2, с.103] і постсавецкі перыяды. Зразумела, што ў аснову такой перыядызацыі пакладзены якасныя, сутнасныя прыкметы.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі гісторыя вышэйшага саслоўя ў Расійскай імперыі больш-менш поўна была вывучана да 1861 г. Гэта тычыцца такіх капітальных прац, як «Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права» А. Рамановіч-Славацінскага, «История сословий в России» В. Ключэўскага, «История дворянского сословия в России» М. Яблачкава і інш. [3]. У першай з указаных прац аб'ектам даследавання стаў юрыдычна-прававы бок гісторыі вышэйшага саслоўя імперыі. Тут знайшлі адлюстраванне і некаторыя аспекты прававога становішча дарэформеннага дваранства Беларусі. А. Рамановіч-Славацінскі падзяліў набілітэт заходніх губерняў на дзве асноўныя часткі — магнатаў і шляхту. Ён падрабязна прыпыніўся на палітыцы «разбору» шляхты, якой даваў станоўчую адзнаку. Лічыў, што рэпрэсіі былі апраўданымі, але запозненымі [4, с. 96].

Гісторыя дваранства парэформеннага перыяду не падвяргалася глыбокаму навуковаму вывучэнню, хаця дваранскае пытанне ў гэтыя гады стала прадметам жорсткай палемікі паміж рознымі грамадска-палітычнымі лагерамі і плынямі. В. Ключэўскі ў канцы 80-х гадоў XIX ст. адзначаў як цікавы момант, што «да гэтай пары мы не сустракаем слушнай, поўнай гісторыі двух вышэйшых саслоўяў Расіі — дваранства і духавенства» [5, с. 31]. Інтарэс да дваранскага пытання паслярэформеннай Расіі быў выкліканы тым, што сацыяльная база імперыі — дваранства паступова страчвала свае палітычныя пазіцыі ў выніку правядзення буржуазных рэформ. Акрамя гэтага, вышэйшае саслоўе, якое мела моц-

ную падтрымку з боку самадзяржаўя да 1861 г., не змагло своечасова і адэкватна адрэа-гаваць на тыя змены ў эканамічным развіцці імперыі, якія адбыліся ў другой палове XIX ст. Няздольнасць значнай часткі зямельнага дваранства ва ўмовах развіцця рынačных адно-сін перабудаваць сваю гаспадарку ў адпаведнасці з капіталістычнымі патрабаваннямі, іх эканамічны крах, актыўны распродаж зямлі, паставілі пытанне аб далейшым лёсе саслоўя. Таму невыпадкова з'явілася вялікае кола публікацый, у асноўным, дыскусійных па форме зместу [6].

Дваранска-кансерватыўная гістарыяграфія прадстаўлена галоўным чынам артыкул. мі і брашурамі публіцыстычнага характару. Яна актывізавалася ў канцы XIX ст. падчас ра-боты Асобай нарады па справах дваранскага саслоўя. У гэтых публікацыях праводзілася ідэя аб памылковасці правядзення буржуазных рэформ у другой палове XIX ст., аб неаб-ходнасці дзяржаўнай падтрымкі вышэйшага саслоўя як галоўнай сацыяльнай апоры сам. дзяржаўнай улады. У першую чаргу, на іх думку, неабходна было ўмацаваць памеснае землеўладанне, а за гэта дваране-памешчыкі павінны былі несці абавязковую дзяржаўну службу [7].

Канцэпцыя ліберальна-апазіцыйнай гістарыяграфіі грунтавалася на прызнанні непа збежнасці буржуазных пераўтварэнняў, якія прывялі да паступовай страты дваранствам сваіх вядучых пазіцый у сістэме самадзяржаўнай улады. У гэтым сэнсе характэрна праца гуртка вольных даследчыкаў з Санкт-Пецярбурга. Яны адзначалі, што «рускія дваранскія ўстановы, паколькі яны звязаны з кацярынінскай ідэяй дваранскай карпарацыі, заўсёды мелі больш дэкаратыўнае, чым земскае значэнне. Цяпер умовы змяніліся. З вызваленнем сялян і іншымі пераўтварэннямі, створаная Кацярынай дваранская карпарацыя страціла сваё універсальнае значэнне і пераўтварылася ў звычайны гурток асоб, якія займаюць у дзяржаве свой пэўны пункт гледжання, які адлюстроўвае іх групавыя інтарэсы, якія нярэд-ка супярэчаць агульнанародным» [8, с. 25, 27]. У сувязі з гэтым С. А. Дзядзюлін, зыходзячы са славянафільскіх пазіцый, заклікаў дваран да маральнасці, грамадзянскасці, адказу аі саслоўных прывілей у новую эпоху [9, с. 41—55].

У цэлым дваранская і буржуазная гістарыяграфія, справядліва адзначаючы змены ў становішчы вышэйшага саслоўя пасля 1861 г., перабольшвала наступствы буржуазных пераўтварэнняў у адносінах да сацыяльна-эканамічных пазіцый вышэйшага саслоўя. Афі-цыйна-ахавальная гістарыяграфія разлічвала звярнуць увагу ўрада да «цяжкага» стано-вішча саслоўя і на неабходнасць зберагчы яго ў якасці надзейнай апоры самадзяржаўя. Лі-берально-апазіцыйны лагер лічыў, што крызіс вышэйшага саслоўя прывядзе да мірнага эвалюцыйнага шляху пераўтварэння самаўладдзя ў канстытуцыйныя нормы.

На думку прадстаўнікоў народніцкай гістарыяграфіі, дваранства — гэта не абавязко-вы элемент феадальнай структуры грамадства ў Расійскай імперыі, а вынік штучнага на-саджэння дзяржавай заходніх пачаткаў, якія былі нехарактэрнымі для рускай гісторыі, не ўласцівы такому дэмакратычнаму народу, як рускі [10, с. 52, 58]. Такое заключэнне М. Ру-бакіна з'явілася абгрунтаваннем яго галоўнай высновы аб эканамічнай і палітычнай інфа-тыльнасці вышэйшага саслоўя Расіі.

Дарэвалюцыйная марксісцкая гістарыяграфія дваранства была прадстаўлена ў ас-ноўным працамі У. І. Леніна, якія таксама насілі палемічны характар. Адразу неабходні адзначыць, што ў залежнасці ад мэты, выказванні У. І. Леніна адносна дваранства, сутна-ці самадзяржаўя нярэдка носяць супярэчлівы характар. Асноўны сэнс іх зводзіцца да на-тупных пастулатаў: дваранства — сацыяльная апора абсалютнай манархіі, параджэнне феадальнай эпохі. У парэформенны час, хаця зямельнае дваранства паступова эвалю-цыяніравала ў бок капіталізацыі гаспадаркі, яно ўсё ж заставалася аплотам феадальных інстытутаў, цэнтрам пераўтачных форм эксплуатацыі — адработак і кабалы. Асабліва, на яго думку, гэта тычылася латыфундыяльнага землеўладання (ад 500 дзес. зямлі і

звыш). У выніку гэтага сялянства было асуджана на дзесяцігоддзі лакутлівай экспрапрыяцыі і няволі [11, т. 10, с. 199—200. т. 16, с. 43, 216; т. 17, с. 151; т. 23, с. 16—17: т. 42, с. 231]. Зразумела, усё было не так проста, як казалася лідару бальшавікоў.

Што тычыцца вышэйшага саслоўя заходніх губерняў, то дарэвалюцыйная гістарыяграфія значна бяднейшая па колькасці прац і іх навуковасці. У парэформенныя гады, асабліва пасля паўстання 1863 г., царскія ўлады хвалявала пытанне, на якіх падставах будаваць сваю палітыку адносна розных класаў і саслоўяў на тэрыторыях «зноў далучаных». Гэта, у першую чаргу, тычылася мясцовага зямельнага і служылага дваранства. Удзел прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання ў паўстанні 1863 г., асабліва дробнай шляхты, фактычна да 1917 г. абумовіў жорсткую палітыку царызму ў адносінах да гэтай катэгорыі саслоўя. З 1863 г. яна характарызавалася хвалепадобным палітычным, эканамічным, адміністрацыйным ціскам у залежнасці ад палітычнай сітуацыі ў імперыі і за яе межамі. Таму галоўная праблема, якая стаяла перад даследчыкамі, замыкалася на пытанні: хто такі дваранін Паўночна-Заходняга краю па сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Абсалютная большасць палітыкаў і даследчыкаў, звычайна афіцыйна-ахоўнай гістарыяграфіі, вельмі прамалінейна адказвалі на гэта пытанне — мясцовы праваслаўны есць рускі, а католік — паляк. У сувязі з гэтым пан лічыўся палякам, а селянін — беларусам [12, с. 180]. Разам з тым беларусы па паходжанні, якія звычайна працавалі ў губернскіх статыстычных камітэтах, былі не згодны з такой пастаноўкай пытання. Яны даказвалі, што вышэйшае саслоўе заходніх губерняў — мясцовага паходжання, якое па палітычных і эканамічных абставінах засвоіла польскую культуру і перайшло ў рымска-каталіцкую веру [13, с. 14]. Аб гэтым сведчыць і той факт, што на пачатку XX ст. у асяроддзі буйных дваран-землеўласнікаў была сфарміравана краёвая ідэя, адным са складовых элементаў якой было тое, што беларуска-літоўскі католік не з'яўляецца палякам [14, с. 19—35]. Такая пазіцыя была характэрна і нават для такога манархіста-кансерватара, як граф І. К. Корвін-Мілеўскі [15, с. 17].

Вышэй пералічаныя працы тычыліся ў асноўным становішча, месца і ролі вышэйшага саслоўя ў пераломны перыяд расійскай гісторыі — рэформ і контррэформ другой паловы XIX ст. Структура саслоўя, яго разрады, маёмасная і сацыяльная дыферэнцыяцыя практычна не з'яўляліся прадметам даследаванняў.

У навуковым сэнсе больш грунтоўна даследавалася зямельнае дваранства. Па гэтаму пытанню маецца шырокая гістарычная літаратура. Важнымі з'яўляюцца тыя аналітычныя працы, у якіх на падставе аналізу землеўладання высвятляліся прычыны страты зямлі вышэйшым саслоўем, яго стратыфікацыя, спосабы пераходу зямлі да іншых саслоўяў, сістэмы вядзення памешчыцкай гаспадаркі. Пры гэтым звычайна даваліся практычныя рэкамендацыі па ўдасканаленні сельскагаспадарчай дзейнасці дваран-землеўласнікаў [16, с. 41—69]. У прыватнасці, беларускі памешчык Ф. К. Глінка лічыў, што дваранскае землеўладанне прыйшло да заняпаду па прычыне падзення цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю. Таму ён прапанаваў праз дапамогу дзяржавы пастаянна падымаць цэны на прадукты земляробства, замяніць прыватны зямельны крэдыт на дзяржаўны [17, с. 4]. А. І. Антановіч таксама лічыў, што слабасць дваранскага землеўладання з'яўляецца следствам іпатэчнай запазычанасці і недахопу даходаў ад земляробства. Самы цяжкі ўдар буйной земляробчай прамысловасці нанесло падзенне цэн на сусветным рынку. Разам з тым, на думку А. І. Антановіча, гэта толькі следства, а прычына тоіцца ў тым, што сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі, асабліва ў цэнтральных губернях Расіі, значна вышэйшы, чым у канкурыруючых з імперыяй краінах. Для выхаду са складанага становішча ён прапанаваў увесці кароткатэрміновыя крэдыты дзяржаўнага банка не толькі пад заклад зямлі, але і сельскагаспадарчай прадукцыі. Даволі пераканаўча абгрунтавана яго прапанова аб заканадаўчым увядзенні догаўтэрміновай арэнды сялянамі зямлі замест гадавой. Пры гэтым

аўтар спасылаецца на вопыт беззямельных шляхціцаў Заходняга краю, якія арандавалі землі ў памешчыкаў тэрмінам да 12 гадоў. Іх ён называе фермерамі, якія маюць свой інвентар, спраўна выплочваюць арэндную плату, жывуць заможна [18, с. 3,14, 30, 32, 43—44]. К. Галавін адным з першых падверг рэзкай крытыцы ўмоўны падзел землеўладання ў Расіі на дробнае (да 100 дзес.), сярэдняе (100—500) і буйнее — звыш 500 дзес. Ён справядліва ўказваў, што «ў кожнай мясцовасці, зыходзячы з інтэнсіўнасці культуры земляробства і ступені прадукцыйнасці зямлі, гэтыя тэрміны маюць living значэнне. Чым вышэй прадукцыйнасць, тым меншы памер пазямельнай уласнасці будзе адпавядаць паняццю аб сярэднім і буйным землеўладанні» [19, с. 28]. Прычыны распрадажы дваранскіх зямель аўтар бачыў у тым, што жыццёвыя патрэбы вышэйшага саслоўя ўзрасталі больш хуткімі тэмпамі, чым павелічэнне даходнасці маёнткаў. Іпатэчныя крэдыты ў Расіі складалі 6 % гадавых, што стрымлівала развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці [19, с. 122—123]. Устойлівасць дваранскага землеўладання ў Беларусі К. Галавін звязваў з распаўсюджаннем тут фермерства ў асобе беззямельнай шляхты і аднадворцаў, якія на падставе доўгатэрміновай арэнды эксплуатавалі землі памешчыкаў [19, с. 127].

У іншым ракурсе прычыны заняпаду дваранскага землеўладання бачыў эканаміст Я. Жыгачоў. Ён звязваў іх з асобай памешчыка. Калі да рэформы 1861 г. памешчык «мог займацца сельскай гаспадаркай як аматар у выніку выпадковых прычын і адвольных суб'ектыўных схільнасцей, раз-пораз фантастычных», то пасля вызвалення сялян «на змену палітычнай уладзе над прыгоннымі рухаючай сілай у гаспадарцы павінна была з'явіцца асабістая прадпрымальнасць гаспадара». Але рэформа, «не ў стане была пераўтварыць безжурботнага і бестурботнага прыгонніка ў энергічнага і дзейнага гаспадара» [20, с. 44—45]. Навуковае абгрунтаванне зямельных мабілізацыйных працэсаў у парэформенныя гады было дадзена ў даследаванні У. Святлоўскага. Характар аграрных адносін залежыў ад формаў землеўладання. Прагрэс у земляробстве ён звязваў з правам бессаслоўнай уласнасці на зямлю. У. Святлоўскі адзначаў, што «права прыватнай уласнасці, якое ператворыць нерухомасць у своеасаблівы рыначны тавар, дало магчымасць распаўсюджання ў гэтай галіне шматлікіх тэндэнцый капіталістычнага тавараабмену... Мабілізацыя, як эканамічная з'ява, — вынік новых капіталістычных умоў» [21, с. 7]. У працы даецца і якасная характарыстыка тром пазямельным перапісам (1877, 1887 і 1905 гг.).

З цягам часу катэгорыі гістарычнай навукі працэрпяваюць відазмяненні, страчваюць свой першапачатковы сэнс. Напрыклад, у спісу землеўласнікаў Мінскай губ. за 1876 г. указваюцца формы набыцця зямлі. У прыватнасці, часта сустракаецца паняцце «данная» зямля. У сучасных даследчыкаў яно выклікае непаразуменне. Таму каштоўнасць працы У. Святлоўскага заключаецца і ў тым, што тут даецца расшыфроўка шмат якіх спецыфічных тэрмінаў, звязаных з формамі мабілізацыі зямельнай уласнасці. Так, «данная» зямля — гэта зямля, якую набылі ў выніку публічных таргоў [21, с. 43].

Такім чынам, рэвалюцыйная расійская гістарыяграфія гісторыі дваранства другой паловы XIX — пачатку XX ст. багатая па колькасці прац. У сувязі з тым, што вышэйшае саслоўе даследавалася сучаснікамі, гэта не магло не паўплываць на характар іх прац. Абсалютная большасць даследаванняў насіла палемічны характар. Больш-менш аб'ектыўныя высновы аб месце і ролі дваранства былі зроблены даследчыкамі ліберальна-апазіцыйнага лагера. Сур'ёзна даследвалася зямельнае пытанне, а разам з ім і зямельнае дваранства. Між іншым гісторыя вышэйшага саслоўя Беларусі не з'яўлялася аб'ектам спецыяльных даследаванняў. На яго звярталі ўвагу ў сувязі з паўстаннем 1863 г., а затым — з рэвалюцыяй 1905—1907 гг. Разам з тым дарэвалюцыйныя даследаванні даюць магчымасць зразумець сацыяльную атмасферу таго часу. Шмат якія зафіксаваныя назіранні тагачасных даследчыкаў могуць быць уключаны ў якасці крыніц у сучасныя працы.

У савецкай гістарыяграфіі практычна да 70-х гг. не існавала даследаванняў, прысвечаных гісторыі дваранства. Першая сур'ёзная праца па гэтай праблеме з'явілася толькі ў 1973 г., калі выйшла ў свет манаграфія Ю. Б. Салаўёва [22]. Прадмет яго даследавання — палітыка самадзяржаўя ў адносінах да дваранства 80—90-х гг. XIX ст. Разам з тым само вышэйшае саслоўе не аналізуецца, але працякаўшыя ўнутры яго працэсы, выяўляюцца праз хадайніцтвы дваранскіх сходаў і рэакцыю на іх правячых вярхоў. Як працяг гэтай манаграфіі, у 1981 г. з'явілася яго праца «Самодержавие и дворянство в 1902—1907 гг.» [23]. Узаемаадносіны паміж самадзяржаўнай уладай, буржуазіяй і дваранствам у паслярэвалюцыйны час даследаваліся ў манаграфіях В. С. Дзякіна [24]. На жаль, і ў гэтых працах дваранства як саслоўе не вывучалася. Значная з'ява ў савецкай гістарыяграфіі — выхад у свет манаграфіі А. П. Карэліна [25]. Упершыню аўтар на падставе матэрыялаў Асобай нарады па справах дваранскага саслоўя (1897—1901 гг.) прааналізаваў юрыдычны, колькасны і нацыянальны склад дваранства імперыі, яго сацыяльна-эканамічны статус, на асобных прыкладах паказаў працэс класавага расслаення, у асноўным гарадскога дваранства, даследаваў карпаратыўную арганізацыю саслоўя, ролю саслоўя ў сістэме мясцовага кіравання, а таксама петыцыйную дзейнасць дваранскіх сходаў. У манаграфіі ёсць паасобныя сюжэты, якія тычацца вышэйшага саслоўя пяці заходніх губерняў. Разам з тым аўтар неправамерна падзяліў усё дваранства Беларусі на польскае і рускае па нацыянальнай прыкмеце [25, с. 45].

У гэтыя ж гады аб'ектам даследавання становіцца і гісторыя рэгіянальнага дваранства. У першую чаргу гэта тычыцца прыбалтыйскага набілітэту [26].

Для беларускай савецкай гістарыяграфіі былі характэрны тыя ж тэндэнцыі, што і для ўсіх гістарычных даследаванняў былога СССР, толькі з сваёй рэгіянальнай спецыфікай. У 20-х гг. завастралася ўвага на нацыянальнай ідэнтыфікацыі дваранства Беларусі. У прыватнасці, У. Ігнатоўскі даследаваў польскі палітычны, рэлігійны і культурны ўплывы на беларускае вышэйшае саслоўе. Яны разумеліся ім як перайманне ладу жыцця, польскіх звычаяў і мовы беларускім набілітэтам [27, с. 140]. Фактычна, пачынаючы з У. Ігнатоўскага, у беларускай савецкай гістарыяграфіі паланізацыя стала трактавацца толькі як вынік палітычных намаганняў польскіх уладаў, што пераклікалася з пазіцыяй афіцыйна-ахоўнай гістарыяграфіі ў Расійскай імперыі і СССР. А. Цвікевіч засяродзіў сваю ўвагу на палітыцы «заходня-русізму» і мерапрыемствах царызму па падтрымцы гэтай плыні ў гісторыі грамадзянскай думкі ў Беларусі. Пры гэтым аўтар пераканаўча паказаў працэс русіфікацыі краю, насаджэння рускага землеўладання, заахвочвання чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі для службы ў заходніх губернях. Ён, як і У. Ігнатоўскі, падзяляў дваранства на польскае і рускае [28, с. 6].

Для 30-х гг. у беларускай гістарыяграфіі была характэрна жорсткая барацьба з «нацдэмамі», «сіяністамі», «польскімі шавіністамі» і г. д. [29, с. 107—201]. У гэтых адносінах паказальныя ўводзіны ў манаграфію Д. А. Дудкова, у якіх аўтар «павесіў» адпаведныя ярлыкі ўсім сваім апанентам [30, с. 3—26].

Па сутнасці да 1980 г. беларускія гісторыкі абыходзілі дваранскую праблематыку. Прарыў у гэтым напрамку быў зроблены С. М. Самбук [31], якая прааналізавала палітыку самадзяржаўя ў Беларусі ў адносінах да дваранства. Пры гэтым было выкарыстана вялікае кола заканадаўчых актаў, матэрыялаў розных міністэрстваў і ведамстваў. Яна звярнула ўвагу на тое, што гэта палітыка была непаслядоўнай, вагалася ў залежнасці ад пазіцыі таго ці іншага Віленскага генерал-губернатара альбо міністра ўнутраных спраў. Зразумела, што прадметам даследавання С. М. Самбук была палітыка самадзяржаўя, а не асабіста дваранства. Таму шэраг аспектаў гісторыі вышэйшага саслоўя Беларусі не знайшоў тут свайго адлюстравання.

У апошняе дзесяцігоддзе дваранская праблематыка прыцягвала ўвагу гісторыкаў Беларусі. Па гісторыі вышэйшага саслоўя краю дарэформеннага перыяду абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі, надрукаваны дзесяткі артыкулаў [32, с. 101—113].

Нацыянальны склад і сацыяльнае аблічча дваранства Беларусі другой паловы XIX ст. акрэслены ў артыкуле А. Г. Каханоўскага. Разам з тым, аўтар, услед за З. Я. Тальвірскай [33, с. 200], неапраўдана доказвае, што на пачатку 60-х гг. XIX ст. толькі 14 % патомных дваран валодалі зямельнымі ўладаннямі. Справа ў тым, што такія працэнтныя суадносіны З. Я. Тальвірская вывела на падставе аналізу дваранства толькі трох паветаў Мінскай губерні, а яны не характарызуюць увесь рэгіён поўнасцю. Некаторыя аспекты гісторыі вышэйшага саслоўя закраналіся пры вывучэнні такіх праблем гісторыі Беларусі, як развіццё капіталізму ў аграрным сектары эканомікі, прамысловасці, гандлі, фінансава-крэдытнай сістэме і г. д. [34]. Серыю артыкулаў і манаграфій развіццю сельскай гаспадаркі Беларусі другой паловы XIX і пачатку XX ст. прысвяціў В. П. Панюціч [35].

Працы беларускіх савецкіх гісторыкаў, прысвечаныя аграрным адносінам у пароэформеннай вёсцы, базіруюцца на марксісцка-ленінскай метадалогіі. Таму галоўная задача, якая стаяла перад даследчыкамі, заключалася ў тым, каб выявіць эвалюцыю аграрнага капіталізму, яго ўзровень у той ці іншы час, ступень дыферэнцыяцыі феадальных саслоўяў — сялян і памесных дваран і фарміраванне на гэтай падставе класаў буржуазнага грамадства. У гэтых працах праводзілася ленінская думка, што латыфундыяльнае, асабліва дваранскае, землеўладанне з'яўлялася базай феадальных перажыткаў у вёсцы, тормазам капіталістычнага развіцця. Прынамсі, ніхто з даследчыкаў гэты пастулат навукова не пацвердзіў. Наадварот, калі і прыводзяцца прыклады капіталізацыі памешчыцкай гаспадаркі, то даследчыкі якраз спасылаюцца на буйныя эканоміі. У працах па аграрнай тэматыцы нас цікавілі матэрыялы, прысвечаныя дваранска-памешчыцкай прадпрымальнасці. У гэтых адносінах важнае месца займаюць манаграфіі М. Ф. Болбаса і Х. Ю. Бейлькіна [36]. М. Ф. Болбас прааналізаваў развіццё прамысловасці Беларусі па ленінскай схеме: хатнія промыслы — рамесная і дробна-капіталістычная вытворчасць — мануфактурная і фабрычна-завадская прамысловасць. Пры гэтым даецца і саслоўная прыналежнасць прадпрымальнікаў, у тым ліку і дваран. Як ужо не раз адзначалася ў беларускай гістарыяграфіі, падлікі аўтара не вытрымліваюць крытыкі ў сувязі з адсутнасцю спасылак на крыніцы. Х. Ю. Бейлькін, хаця і прыводзіць даныя чыгуначных вывазаў сельскагаспадарчай прадукцыі з тэрыторыі Беларусі, разам з тым значна завысіў экспартныя магчымасці аграрнага сектару краю. У адным з сваіх артыкулаў [37, с. 70—76] аўтар сцвярджае, што «першае парэформеннае 20-годдзе ўяўляе сабой своеасаблівы «зорны час» аграрнага капіталізму ў Беларусі» [37, с. 71]. Пры гэтым ён спасылаецца толькі на павелічэнне маштабаў вывазу збожжа з краю. Па нашых даных, як будзе паказана далей, гэты перыяд быў гадамі глыбокага крызісу памешчыцкай гаспадаркі, асабліва ў прадстаўнікоў рымска-каталіцкага веравызнання. Таму пад'ём сельскгаспадарчай вытворчасці неабходна шукаць у развіцці сялянскай гаспадаркі, а не браць агульныя лічбы. На гэтую акалічнасць звярнулі ўвагу яшчэ А. Цвікевіч і М. Доўнар-Запольскі. Так, А. Цвікевіч адзначаў, што ў 70-х — пачатку 80-х гг. XIX ст. памешчык-каталік «упарта трымаўся за зямлю, нягледзячы на неспрыяльную эканамічную кан'юктуру» [38, с. 131]. М. Доўнар-Запольскі ўспамінаў: «Калі мне прыйшлося працаваць у нясвіжскім архіве, я быў здзіўлены, калі трапіў у прыдворную атмасферу XVIII ст.: усё засталося па-старому, толькі кунтушы васалаў Радзівіла замяніліся даўгаполымі сурдутамі і на прыдворных не блішчэла зброя» [39, с. 63].

У працах польскіх гісторыкаў закраналіся такія праблемы, як працэс паланізацыі дваран «усходніх крэсаў», палітыка самадзяржаўя адносна вышэйшага саслоўя, нацыянальны склад, аграрнае пытанне і г. д. Неабходна адзначыць, што ў польскай гістарыяграфіі няма адназначных ацэнак становішча дваран-католікаў у Беларусі ў азначаны час. Большасць гісторыкаў лічыць, што канфесійная прыналежнасць служыць галоўным крытэрыем нацыянальнай ідэнтыфікацыі дваранства [40, с. 60]. У той жа час В. Вярэніч сцвярджае, што перасяленні прадстаўнікоў вышэйшых сацыяльных класаў з Польшчы ў Беларусь мелі эпізадычны характар [41, с. 207]. Р. Радцык даказвае, што апалячанае дваранства беларуска-польскага памежжа змагалася за Польшчу, але яно называла сябе ліцвінамі, мела вялікія пачуцці замілаванасці да сваёй радзімы — Літвы-Беларусі. Разам з тым аўтар адзначае, што вышэйшае саслоўе недастаткова ўсведамляла вартасць культурнага патэнцыялу беларускага этнасу — шырокіх народных мас [42, с. 110, 112]. Палітыку самадзяржаўя ў дачыненні да дробнай шляхты даследавала І. Сікорска-Кулежа з канца XVIII да 1868 г. [43]. Яна паказала характэрныя рысы гэтай палітыкі ў розныя гады. Скрупулёзна раскрыла механізм «разбору» шляхты на «сапраўдную» і «фальшывую» у 1831 — 1834 гг., перавод апошняй у стан аднадворцаў і мяшчан. Працэс верафікацыі шляхты ў 1834—1863 гг. аналізуецца ў чацвёртай главе. Даследчыца справядліва ўказвае, што ціск на дробную шляхту ў 40—50-х гадах некалькі паменшыўся. Паўстанне 1863 г. і палітыка самадзяржаўя пасля яго паражэння фактычна ліквідавала шляхту як сацыяльную групу.

Такім чынам, аналіз гістарычных даследаванняў, прысвечаных гісторыі дваранства Беларусі 2-й паловы XIX — пачатку XX ст., дае падставы для вырашэння наступных задач: выявіць разрады, падраздзяленні, крыніцы папаўнення дваранства, дынаміку яго колькаснага і нацыянальнага складу. Акрамя гэтага, важнае занчэнне мае даследаванне гісторыі памеснага дваранства, яго прадпрымальніцкай дзейнасці як у сферы сельскагаспадарчай, так і прамысловай вытворчасці. Цікавасць выклікае і дзяржаўная палітыка ў адносінах да вышэйшага саслоўя, яго роля ў сістэме мясцовага кіравання.

*Літаратура*


1. Павленко Н. И. Летописцы Отечества // С. М. Соловьев. Общедоступные чтения о русской истори. М., 1992.
2. Караў Д. Беларуская гістарыяграфія XX ст. — адна з крыніц фарміравання менталітэту нацыі // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 3.
3. Романович-Славатинский А. Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права. Киев, 1912; Ключевский В.О. История сословий в России: Курс читанный в Московском университете в 1886 году. 2-е изд. М., 1914; Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб., 1876.
4. Романович-Славатинский А. Дворянство в России...
5. Ключевский В. О. История сословий в России...
6. Дворянство в России. Исторический общественный очерк // Вестник Европы. — 1887. № 9; Кошкарев П. О. О дворянском сословии в России. СПб., 1885; Неплюев. Историческое призвание русского помещика. М., 1880; О русском и польском дворянстве // Московские ведомости. 1864. № 184; Савелов Л. Статьи по генеалоги и истории дворянства. СПб., 1898. Пазухин А. Современное состояние Росси и сословный вопрос. М., 1886; Ковалевский М. Чем Россия обязана Союзу объединенного дворянства. СПб., 1914. Ознабишин Вл. Дворянская идея в прошлом. М., 1908; Русское дворянство. Кружок свободных исследователей. СПб., 1907; Палтов Вл. «Взгляд и нечто» о дворянстве. М., 1904; Дедюлин С. А. Крестьянское самоуправление в связи с дворянским вопросом. СПб., 1902; Рубакин Н. А. Россия в цифрах. Опыт статистической характеристики сословно-классового состава населения русского государства. СПб., 1912; Он же. Российское

дворянство в цифрах. Трудовой путь. 1907. № 11, 12, Семенов Н. П. Наше дворянство. СПб. 1899; Елишев А. И. Дворянское дело. М., 1898; Он же. Современные дворянские вопросы. СПб. 1897; Ярмошкин В. Задачи дворянства. СПб., 1895 и др.
7. Елишев А. И. Дворянское дело. М., 1898; Кошкарев И. Д. Современное состояние России и сословный вопрос. М., 1886; Семенов Н. П. Наше дворянство. СПб., 1899; Фадеев Р. А. Чем нам быть. Русское общество в настоящем и будущем. М., 1874 и др.
8. Русское дворянство. Кружок свободных исследователей. СПб., 1907.
9. Дедюлин С. А. Крестьянское самоуправление в связи с дворянским вопросом. СПб., 1902.
10. Рубакин Н. А. Россия в цифрах..
11. Ленин В. И. Полн. собр. соч.
12. Эркерт Р. Ф. Взгляд на историю и этнографию Западных губерний. СПб., 1864. С. 61—62; Харузин Ал. Славянское жилище в Северо-Западном крае // Виленский временник. 1907. Кн. 2.
13. Сементовский А. Этнографический обзор Витебской губерни. СПб., 1872. С. 26—27; Романов Е. Очерки Витебской губернии // Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. Витебск. 1898. Приложения. С. 88; Канчар Е. С. Классовая, национальная и религиозная борьба в Белоруссии. Ч. 1. Территория. Население. Классовый состав. М., 1918.
14. Смалянчук А. «Краёвасць» у беларускай і літоўскай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны агляд. Т. 4. Сшыткі 1—2 (6—7). 1997. Снеж.
15. Корвин-Милевский И. К. К чему должно стремиться литовское дворянство. Вильна, 1911.
16. Дворянский банк о положении дворянского землевладения (Движение дворянского землевладения) // Русское богатство. 1898. № 5; Соболев М. Мобилизация земельной собственности. М., 1898; Движение землевладения потомственных дворян с 1861 до 1897 г. // Вестник финансов. 1898. № 12; Святловский В. Мобилизация земельной собственности в России. СПб., 1909; Фортунатов Евг. Захватное, капиталистическое и трудовое землевладение в России // Борьба за землю. СПб., 1908. Т. 1; Глинка Ф. К. К вопросу об улучшени положения земельного дворянства. Могилев-на-Днепре, 1899; Антонович А. И. Вопросы земледельческой промышленности и дворянского землевладения в России. М., 1898; Головин К. Крупное землевладение в Западной Европе и Росси. М., 1887; Васильчиков А. Землевладение и земледелие в России и других европейских государствах. 2-е изд. СПб., 1881. Т. 1, Дроздов И. Г. Судьбы дворянского землевладения в России и тенденци его мобилизации. Пгр., 1917; Радциг А. А. Скотоводство и молочное хозяйство в разных государствах. СПб., 1899; Блиох И.С. Исследование по вопросам, относящимся к производству, торговле и передвижению скота и скотских продуктов в России и за границей. СПб., 1876; Баньковский В. Аграрная революция и польское землевладение в Западном крае. Пгр., 1917; Жигачев Е. Задолженность частного землевладения в России // Русская мысль. 1892. № 11.
17. Глинка Ф. К. К вопросу об улучшении положения земельного дворянства. Могилев-на-Днепре. 1899.
18. Антонович А. И. Вопросы земледельческой промышленности и дворянского землевладения в России. М., 1898.
19. Головин К. Крупное землевладение в Западной Европе и в России. М., 1887.
20. Жигачев Е. Задолженность частного землевладения в России // Русская мысль. 1892. № 11.
21. Святловский В. Мобилизация земельной собственности в России. СПб., 1909
22. Соловьев Ю. Б. Самодержавие и дворянство в конце XIX века. Л., 1973.
23. Соловьев Ю. Б. Самодержавие и дворянство в 1902—1907 гг. Л., 1981.
24. Дякин В. С. Самодержавие, буржуазия и дворянство в 1907—1911 гг. Л., 1978; Дякин В. С. Буржуазия, дворянство и царизм в 1911—1914 гг. Разложение третьеиюньской системы. Л., 1988.
25. Корелин А. П. Дворянство в пореформенной России. 1861—1904 гг. Состав, численность, корпоративная организация. М., 1979.
26. Духанов М.М. Остзейцы: Политика остзейского дворянства в 50—70 гг. XIX в. и критика его апологетической историографии. Рига, 1978; Карьяхярм Т. Эстонская буржуазия, самодержавие и дворянство в 1905—1917 гг. Таллин, 1987; Кивимяэ С. Остзейское дворянство и распространение деятельности Крестьянского поземельного банка на прибалтийские губернии // Германия и Прибалтика. Рига, 1988 і інш.

27. Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мн., 1991.
28. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. М., 1993.
29. Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг.) Мн., 1985.
30. Дудкоў Д. А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX стагоддзя. Мн., 1932.
31. Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980.
32. Туміловіч Г. М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзяў. Мн., 1995. С. 114—128; Лугавцова С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX вв. Мн., 1997; Грыцкевіч А. Беларуская шляхта // Спадчына. 1993. № 1; Сяменчык М. Я. Становішча гарадской шляхты Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст (Сацыяльны аспект) // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя.
33. Тальвирская З. Я. К вопросу о социальном облике мелкого дворянства в 1860-х годах (по материалам трёх уездов Минской губернии) // Историко-социологические исследования. М., 1970
34. Пичета В. И. История белорусского народа // Курс Белорусоведения: Лекции. М., 1918—1920; Ён жа. Класавыя супярэчнасці ў Беларусі напярэдадні рэвалюцыі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. М., 1924; Ён жа. Крестьянское и рабочее движение в Белоруссии в эпоху 1905 года. Мн., 1926; Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии в 1861—1914 гг. Мн., 1926; Дудкоў Д. А. Аб развіцці капіталізму ў другой палове XIX і пачатку XX ст. Мн., 1932; Кернажыцкі К. І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мн., 1932; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962; Ён жа. О развитии капитализма в помещичьем хозяйстве Белоруссии в конце XIX и начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1961 г. Рига, 1963; Кожушков А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1963; Экономика Белоруссии в эпоху империализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.). Мн., 1971; Ён жа. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978; Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861—1914 гг. Мн., 1989.
35. Панюціч В. П. Аб развіцці капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў пачатку XX ст. (1900—1914 гг.) // Весці БССР. Сер. грамад. навук. 1964. № 3. С. 76—83; Ён жа. Танкарунная авечкагадоўля ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст. (1861—1900 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1975. № 6. С. 96—112; Ён жа. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990; Пазямельныя арэндныя адносіны на Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 4. С. 40—50; Ён жа. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861—1914 гг. Мн., 1996.
36. Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. Мн., 1978; Ён жа. Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988; Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861—1914 гг. Мн., 1989.
37. Бейлькін Х. Да пытання аб фермерах і кулаках на Беларусі (другая палова XIX — пачатак XX ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 4.
38. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»...
39. Довнар-Запольский М. Народное хозяйство...
40. Ryszard Mienicki. Ziema Nowogródzka w dobie porozbiorowej (1793—1915). Wilno, 1935; Wakar W. Rozwoj terytorialny narodowosci polskiej. Struktura narodowosciowa kresow wschodnich. Kiew, 1917; Eberhardt P. Przemianiy narodowosciowe na Białorusi. Warszawa, 1994 і інш.
41. Werenicz W. Historyczne i kulturalne podstawy swiadomosci narodowej Polakow w Związku Radzieckim (na przykladzie Bialorusi) // Polacy w kosciele katolickim w ZSSR. Lublin, 1991.
42. Radzik Ryszard. Miedzy zbiorowoscia etniczna a wypolnota narodowa. Bialorusini na tleprzemian narodowych w Europie Srodkowo-wschodniej XIX stulecia. Lublin, 2000.
43. Sikorska-Kulesza I. Deklasacija drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX wieku. Warszawa, 1995.